Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
________________ Ю. П. Бондар
«____» _____________ 2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ___ / вуч.

# ЭТНАСЕМІЁТЫКА

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнік**

*А. У. Рагуля,* прафесар кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, прафесар

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* беларускай літаратуры і культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка»;

*Т. І. Кухаронак,* старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 15.12.2011 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 24.09.2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *А. У. Рагуля*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Этнасеміётыка» – адна з базавых у прафесійнай падрыхтоўцы студэнтаў па напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор). Яна ахоплівае праблемы даследавання сэнсаў этнічнай культуры, вызначэнне іх агульначалавечай значнасці. Галоўным аб’ектам даследавання ў семіётыцы з’яўляюцца культурныя сэнсы, пабудаваныя ў эвалюцыйныя рады і семіятычныя ланцугі, на аснове якіх фарміруецца самастойнае вербальнае выказванне. Дысцыпліна «Этнасеміётыка» скіравана на фарміраванне ў студэнтаў здольнасці абагульнення культурнай інфармацыі і ўвасаблення яго ў сацыяльную практыку.

Дысцыпліна «Этнасеміётыка» мае інтэграцыйны характар. Для яе засваення студэнты выкарыстоўваюць веды, уменні і навыкі, набытыя падчас вывучэння сумежных дысцыплін «Гісторыя Беларусі», «Культуралогія», «Этнаграфія», «Вусная народная творчасць».

*Мэта* дысцыпліны – засваенне метадаў і фарміраванне практычных навыкаў аналізу і сэнсаў этнічнай культуры; выкарыстанне гэтых метадаў і навыкаў у дзейнасці ўстаноў культуры.

*Задачы:*

– азнаямленне з прынцыпамі арганізацыі і функцыянавання семіёзісу;

– раскрыццё асноўных праблем культурнай семантыкі і культурагенезу;

– засваенне форм і метадаў аналізу семіятычнага дыскурсу.

У выніку засваення дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– гістарычную тыпалогію культурнага працэсу;

– паняційны апарат тэарэтыка-метадалагічнага даследавання культуры;

– праграмны матэрыял па гісторыі і філасофіі культуры;

*умець:*

– валодаць метадамі аперацыянальнай даследчыцкай і творчай дзейнасці;

– праяўляць аналітычную кампетэнтнасць, неабходную для збірання і захоўвання традыцыйнай культурнай спадчыны;

– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях этнасеміётыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дысцыпліна «Этнасеміётыка» прадугледжвае наступныя педагагічныя метады навучання: тэарэтыка-інфармацыйныя метады: вусныя (лекцыя, тлумачэнне, кансультаванне), наглядныя (паказ, знаёмства з дэпаніраваным навукова-метадычным фондам); метады самастойнай работы студэнтаў: засваенне канцэптуальных палажэнняў этнасеміётыкі шляхам чытання рэкамендаванай літаратуры, канспектаванне асобных тэарэтычных палажэнняў; кантрольна-ацэначныя метады: вуснае выступленне, адказы на тэставыя заданні, апытанне.

Самастойная работа прадугледжвае вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны, стварэнне прэзентацый, напісанне пісьмовых аналітычных работ.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Этнасеміётыка» прадугледжана ўсяго 256 гадзін, з якіх 102 гадзіны – аўдыторныя заняткі (78 гадзін – лекцыі, 24 гадзіны – семінары).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўд. гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | сем. |
| **Раздзел І. Культурагенез і культурная семантыка** | | | |
| *Тэма 1.* Этнасеміётыка ў комплексе антрапалагічнага ведання | 8 | 8 | |
| *Тэма 2.* Гістарычная тыпалогія культурнага працэсу і фарміраванне народнай культуры | 6 | 6 | |
| *Тэма 3.* Тэорыя народнасці культуры ў еўрапейскай культурфіласофіі | 8 | 6 | 2 |
| *Тэма 4.* Семіятычны дыскурс | 8 | 6 | 2 |
| **Раздзел ІІ. Семіёзіс у беларускай культуры на стадыі грамады (абшчыны)** | | | |
| *Тэма 5.* Рэгулятывы і патэрны ў беларускай культуры эпохі матрыярхату | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 6.* Сумарны вопыт культурагенезу ў культуры патрыярхату | 8 | 6 | 2 |
| *Тэма 7.* Сімволіка самавызначэння этнасу ў культуры каляндарна-земляробчага тыпу | 8 | 6 | 2 |
| **Раздзел ІІІ. Беларуская культурная семантыка на стадыі дзяржаўнай арганізацыі этнасу** | | | |
| *Тэма 8.* Семіёзіс у эпоху дзяржаў-княстваў і дзяржаў-зямель | 8 | 6 | 2 |
| *Тэма 9.* Семіёзіс у беларускай культуры ў эпоху цэнтралізаванай дзяржавы | 8 | 6 | 2 |
| *Тэма 10.* Антрапацэнтрычная семантыка і нацыягенез у эпоху еўрапейскага Рэнесансу | 8 | 6 | 2 |
| **Раздзел IV. Семіёзіс у культуры нацыянальна-дэмакратычнага тыпу (другая палова XVII–XIX ст.)** | | | |
| *Тэма 11.* Беларускі этнагенез і семіёзіс у эпоху Асветы | 8 | 6 | 2 |
| *Тэма 12.* Фальклярызацыя і семіёзіс у эпоху каланіяльнай залежнасці (канец XVIII–XIX ст.) | 8 | 6 | 2 |
| *Тэма 13.* Беларуская народная культура і нацыянальная дактрына | 10 | 6 | 4 |
| **Разам…** | **102** | **78** | **24** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Раздзел I. Культурагенез і культурная семантыка

### *Тэма 1. Этнасеміётыка ў комплексе антрапалагічнага ведання*

Семіётыка як тэарэтыка-метадалагічная галіна навуковага даследавання культуры. Паняцце парадыгмы. Нацыянальны *стыль* і *парадыгма*. Катэгорыі *знак* і *культурны сэнс*. Знакавасць у працэсе кагнітыўнага дзеяння. Знакавая сістэма фальклору. Праца Арыстоцеля «Пра вытлумачэнне». Семіётыка Бібліі. Прадмовы Ф.Скарыны. Праблемы семіёзісу ў філасофіі эпохі Асветы: «Вопыт чалавечага разумення» Дж. Лока, «Даследаванне чалавечага пазнання» Д. Юма. Праца І. Канта «Крытыка здольнасці выказвання»: роля рэфлексіі і тэлеалогіі. «Манадалогія» Г.Лейбніца. Мадэлі разумення ў даследаваннях Дж.Віко «Асновы новай навукі пра агульную прыроду нацыі» (1725). «Фенаменалогія духу» Г. В. Ф. Гегеля (1770–1831). Працы Ч. У. Морыса (1901–1978) «Асновы тэорыі знакаў» і «Знакі і дзеянні». Структура семіёзісу: *сінтактыка, семантыка* і *прагматыка*. Кантэкст у структуры кагнітыўнага дзеяння. Роля *апасродкаванага (абагульненага) улічвання* ў развіцці семіятычнай аксіяматыкі. Рэляцыйная функцыя знака ў функцыянальным працэсе семіёзісу. Рэальны і патэнцыяльны знакавы кантынуум. Фрэймы *трыдзевятае царства, вырай, новая зямля, казка жыцця* ў семіёзісе беларускага кантынуума. Натуральная мова і фармальная канцэпцыя мовы. Уніфікацыя матэматычнай мовы. Лагічны сінтаксіс і фенаменалагічная (рэчавая) аснова семантыкі. Каляровая і інтанацыйная (музычная), пластычная (выяўленчая) і вербальная (слоўная) сімволіка. Мастацкі вобраз, яго разнавіднасці: алегорыя, алюзія, эмблема, сімвал. *Сінтактычнае, семантычнае* і *прагматычнае* вымярэнні семіёзісу. Канцэпцыя *сімвалічнага пераўтварэння* ў працы Сьюзен Лангер (1895–1985) «Філасофія ў новым ключы: Даследаванне сімволікі розуму, рытуалу і мастацтва» (1942). Канцэпцыя эстэтыка-мастацкага ведання ў фенаменалогіі Г. Г. Шпэта (1879–1937; «Эстэтычныя фрагменты», «Праблемы сучаснай эстэтыкі»). Этнасеміётыка як прыватная галіна семіётыкі культуры. Паняцці *этнас, аб'ектыўная*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і *суб'ектыўная культура*. Мабілізуючая функцыя этнасеміётыкі. Этнічная самасвядомасць як аб'ект семіятычнага даследавання. Галоўная мэта навуковага пошуку – фарміраванне *здольнасці этнічнага самаканстытуявання*.

Асноўныя задачы этнасеміётыкі: даследаванне культурных сэнсаў этнічнай культуры, азначэнне іх агульначалавечай значнасці, фарміраванне ў навучэнцаў здольнасці інтэграванага абагульнення ў форме *вербальнага выказвання* і ўвасаблення ў сацыяльную практыку.

Роля роднай мовы і маўленчай дзейнасці ў фарміраванні парадыгматычнага ведання. Родная мова і ўзровень міжасобасных камунікацый. Праца Ж.Піажэ пра сінхранізацыю мовы і развіццё інтэлекту («Схемы дзеяння і засваенне мовы»). Катэгорыі *праксіс* і *прагматыка*. Біятычны аспект семіёзісу. Міждысцыплінарныя ўзаемасувязі этнасеміётыкі з філасофіяй, культуралогіяй, літаратуразнаўствам, мастацтвазнаўствам, сацыялогіяй.

## *Тэма 2. Гістарычная тыпалогія культурнага працэсу і фарміраванне народнай культуры*

Крытэрый гістарычнай тыпалогіі культуры: каштоўнасны аспект. Стадыяльнае развіццё соцыуму. Стадыя грамады і стадыя дзяржаўнага (цывілізацыйнага) існавання соцыуму. Праца Ф.Цёніса «Грамада і грамадства». Радзіна (родавая абшчына). *Кроўна-сваяцкі* тып культуры. Сакралізацыя экзістэнцыяльных і сацыяльных каштоўнасцей: *мацярынства, братэрства, роднасць. Монафізіцтва* як духоўная першааснова светаадчування. Пачуццё роднасці і гераічны комплекс падсвядомага. Ахоўны сэнс інстытута родавай помсты. Першапачатковыя сімвалы быцця: усеагульная Маці-Багіня-Прырода і герой-асілак. Бэстыярый і татэмныя продкі як рэгулятывы і патэрны. Першапачатковая каляровая сімволіка існавання. Усталяванне мяжы паміж тым і гэтым светам. Шанаванне памяці продкаў у эпоху палеаліту. Свядомае канструяванне *чалавечай сітуацыі* (Э. Фром). Табу на інцэст. Станаўленне містэрыяльнага канона ў культуры. Эвалюцыйны рад атрыбутыўных сімвалаў (знакаў) эпохі матрыярхату: Велендорфская (у Аўстрыі) жаночая выява (35 тыс. гадоў да н.э.), тэракотавая фігурка жанчыны-філосафа з сяла Чарнавода ў Румыніі (4 тыс. гадоў да н.э.), жаночая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выява з в. Елісеевічы (Браншчына, 22 тыс. гадоў да н.э.). Традыцыі старажытнасці ў творчасці А. Дзюрэра, А. Гараўскага, А.Радэна, М.Савіцкага. Матыў «травіца брат-сястрыца». Эпоха патрыярхату. *Каляндарна-земляробчы* тып культуры. Ключавыя канцэпты: *ніва, гаспадар, культурны герой, разумная дачка, музыка-чарадзей*.

Неалітычная аграрная рэвалюцыя. Новыя сэнсы і функцыі бэстыярыю. Алюзія і алегорыя ў вуснай прозе. Атрыбутыўныя персанажы «казак пра жывёл». Канцэнтраваныя сэнсы быццяіснавання ў кераміцы і ткацтве.

Арганічная інтэграцыя каштоўнасцей культуры кроўна-сваяцкага і каляндарна-земляробчага тыпаў. Пашырэнне паняццяў роднасці. Канцэпт *людскасць*. Арыентацыя на агульначалавечыя каштоўнасці. Сацыяльная роля эстэтычнай свядомасці і ўніверсальнай этыкі.

*Саслоўна-каставы* і *алігарха-дэмакратычны* тыпы культуры ў эпоху старажытных цывілізацый. Паняцці *канон* і *рытуал*. Штучны сімбіёз народнай пластыкі і афіцыйнай ідэалогіі ў культуры Егіпта і Шумеру. Функцыі *пірамiды, сфінкса, шэду*. *Тэракотавая армія* імператара Шыхуандзі (III век да н.э.).

Народна-гераічны эпас у Егіпце («Міф пра Асірыса»), Шумеры («Эпас пра Гільгамеша»), Індыі («Махабхарата», «Рамаяна»), старажытнай Грэцыі («Іліяда», «Адысея»), Рыме («Энеіда» Вяргілія). Абагульненыя сэнсы эпасу – папярэджанне аб катастрафізме выбранага ўладарамі шляху. Індустрыяльна-гандлёвы і нацыянальна-дэмакратычны тыпы еўрапейскай культуры Новага часу.

## *Тэма 3. Тэорыя народнасці культуры ў еўрапейскай культурфіласофіі*

Рэабілітацыя народнай культуры ў эпоху еўрапейскага Рэнесансу і Асветніцтва. Народнасць культуры і нацыянальнае адраджэнне ў працы Дж. Віко «Новая навука пра нацыі» (1725), Ё. Гердэра (1744–1803; «Ідэі да філасофіі чалавецтва»), М. Дабралюбава («Пра ступень удзелу народнасці ў рускай літаратуры», 1861), М. Бахціна («Творчасць Франсуа Рабле і народная культура эпохі Сярэдневякоўя і Рэнесансу»).

Беларуская тэарэтычная думка пра народнасць літаратуры. Роля народнасці ў адраджэнні нацыянальнай інтэлігенцыі ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працы Р. Падбярэскага «Ян Баршчэўскі і Беларусь». Праблема «арганічнай народнасці» (М. Грынчык) у пісьменніцкай публіцыстыцы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, В. Ластоўскага, М. Гарэцкага. Неаязычніцтва і неаміфалагізм у беларускім адраджэнскім руху нашаніўскага перыяду. Філасофскае абагульненне беларускага і еўрапейскага нацыянальнага рэнесансу ХХ ст. у беларускім неагегельянстве. Працы У. Самойлы («Гэтым пераможаш!..», 1924), І. Канчэўскага («Адвечным шляхам», 1921). Фальсіфікацыя агульначалавечых каштоўнасцей народнасці афіцыйнай ідэалогіяй. Афіцыйная народнасць і партыйнасць. Канцэпты *праўда веку* і *рэальная фантазія* ў творчасці К. Чорнага («Маладыя празаікі», 1934, «Думкі пра Паўлюка Труса», 1939), І. Мележа («Берагчы вялікія скарбы», 1963, «І сёння, і заўтра, і заўсёды», 1966). Супрацьстаянне «ідэалагічнаму ачмурэнню». Публіцыстыка В. Быкава («Жывыя–памяці мёртвых», 1962, «Вялікая акадэмія–жыццё», 1975, «Крыжовы шлях», 1998). Канцэпцыя «натуральнай народнасці» ў працы М. Грынчыка «Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі» (1969). Народнае мастацтва і феномен фальклярызацыі ў даследаванні А. Лявонавай «Старажытнабеларуская скульптура».

## *Тэма 4. Семіятычны дыскурс*

Фальклорная анталогія: сцверджанне адсутнасці неіснавання. Фальклорны экзістэнцыялізм: адлюстраванне аднаразовай каштоўнасці жыцця ў сімволіцы колераў белага, чырвонага і чорнага. Фальклорная эпістэмалогія. *Мысленнае дрэва* – сімвал станаўлення і ўзвышэння асобы, парадыгматычны вобраз віталізму ў беларускай культуры. Канцэпты *покліч* і *імпульс*, *свет бязмежны – мой дом*, фрэймы *повязь* і *вузел* – вербальная сімволіка *філасофскага адзінства* і *рэальнай шматграннасці* жыцця. Гарызантальная дынаміка ў фальклорнай канцэпцыі чалавечага шляху. Вобраз ручніка і вянка. Канцэпт *раздолле* і фрэйм *прастор*. Базавая структура кагнітыўнага дзеяння ў народнай культуры: **ява (з’яўленне) – пераадоленне – станаўленне – выйсце**. Роля вогненнай сімволікі ў фальклорнай тэорыі жыцця і тэорыі пазнання. Сферычная структура дынамікі культурных сэнсаў: *імпульс – матыў – хранатоп – праблемная сітуацыя – канцэпт – выказванне – стыль*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Халістычная канцэпцыя фальклорнай філасофіі існавання і кагнітыўнага дзеяння ў працы А. Весялоўскага «Паэтыка сюжэтаў» (1906), А. Маліноўскага (1884–1942) «Арганаўты заходняй часткі Ціхага акіяна».

Актуальныя праблемы семіёзісу сучаснай культуры. Дылема «знак бяды» (В. Быкаў) і сама бяда. Канцэпталогія і выказванне ў даследаваннях Ю. Сцяпанава «У свеце семіётыкі» і «Семіётыка канцэптаў», У. Конана «Эстэтычныя і этычныя погляды Ф. Скарыны».

Семіётыка як *арганон* (інструмент) даследавання ў працы Р. Якабсона (1896–1982) «У пошуках сутнасці мовы». Канцэпталогія Ж. Дэлёза. Канцэпт, канцэптуальныя персанажы і план іманенцыі ў яго працах «Логіка сэнсу» і «Што такое філасофія» (1985). Трансфармацыя і ўзбуйненне традыцыйных аб'ектаў атрыбутызацыі. Душа як анталагічны праект у працы Яна Патачкі (1907–1977) «Еўропа і пост-Еўропа. Постеўрапейская эпоха і яе духоўныя праблемы».

Фрэймы *душа* і *вялікае сэрца* – ключавыя арыенціры ў беларускай культуры XX ст.

## Раздзел II. Семіёзіс у беларускай культуры на стадыі грамады (абшчыны)

### *Тэма 5. Рэгулятывы і патэрны ў беларускай культуры эпохі матрыярхату*

Адзінства экзістэнцыяльных і сацыяльных каштоўнасцей у эпоху матрыярхату. Культурнае табуіраванне. Інстытут родавай помсты. Ключавы імператыў – выжыць чалавекам. Каштоўнасны аспект абагульненай карціны быцця і ўніверсальная сімволіка: *купала (кубло), брахмо (багно), яно*. Базавыя сюжэты: *маці і яе дзеці, злодзей Цмок* і *асілак*. Міфалагема *брат* і *сястра*. Зааморфныя і антрапаморфныя выявы з в. Асавец. Вадаплаўныя птушкі. Персаніфікаваныя вобразы мацярынства: Купала, Лада, Мокша. Трыумфальная фаза пераадолення: канец-пачатак. Вобраз сусветнага вяселля і яго аналагі ў чалавечым свеце. Чарнабог – уладар падземнай энергіі і нябесная Маці-вада. Сакральная, гераічная і побытавая свядомасць эпохі матрыярхату. Вадаплаўныя (балотныя) птушкі ў міфалогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Семантыка сімвалаў *гняздо, купала, кубло, Купала.* Магія і семантыка *абмывання* ў радзінным абрадзе.

### *Тэма 6. Сумарны вопыт культурагенезу ў культуры патрыярхату*

Верхні неаліт і век металу ў Беларусі. Аграрная неалітычная рэвалюцыя. Канцэнтраванае адлюстраванне культурнага вопыту ў керамічнай сімволіцы. Разетка і геаметрычны арнамент. Абагульнены вобраз жыцця ў штрыхаванай кераміцы. Сацыяльны статус вялікай і малой сям'і. Станаўленне каляндарнай абраднасці. Атрыбуцыя ключавых персанажаў. Вербальныя зносіны: эстэтычнае ўспрыманне навакольнага свету ў песенным фальклоры. Трансфармацыя зааморфных сімвалаў міфалогіі. Тыпалогія характараў. Новыя мадэлі гераічнай свядомасці: перагляд антыноміі вялікае – малое. Ключавыя ўніверсаліі: *гаспадар, ніва, музыка.*

### *Тэма 7. Сімволіка самавызначэння этнасу ў культуры каляндарна-земляробчага тыпу*

Інтэграцыя кроўна-сваяцкага і каляндарна-земляробчага вопыту. Станаўленне прымітыўнай народнай дэмакратыі. Княжанні як протадзяржаўныя структуры. Неўры і іх роля ў фарміраванні беларускага этнасу. Барацьба супраць усходняй тыраніі. Волат і Каваль-Вярнідуб. Атрыбутацыя катэгорыі *цікаўныя*. Баладныя цыклы: культ сацыяльнай актыўнасці. Славяне і этнічныя працэсы ва Усходняй Еўропе ў пачатку новай эры. Барацьба супраць усходняй тыраніі.

Рэгулятыўныя функцыі язычніцкай міфалогіі. Рацыяналізацыя традыцыйных персанажаў: антрапацэнтрычная дынаміка, культ Дажбога, Лады, Цёці. «Дагаворныя» адносіны з персанажамі ніжняй міфалогіі. Перавага салярнай і раслінай сімволікі. Сакральныя першапродкі Дзед і Баба – захавальнікі духоўнай спадчыны.

Канцэпты *людскасць, хараство, роднасць, гуртавое*. Тыпы лірычнага перажывання ў абрадавай паэзіі. Аксюмаронная структура вобраза і сінестазія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Беларуская культурная семантыка на стадыі дзяржаўнай арганізацыі этнасу

### *Тэма 8. Семіёзіс у эпоху дзяржаў-княстваў і дзяржаў-зямель*

Станаўленне саслоўна-феадальнай структуры беларускага соцыуму ў другой палове першага тысячагоддзя. Гарадзішча і раннефеадальны горад. Трансфармацыя народнага сходу ў веча. Крытэрый роднасці ў фарміраванні племянных саюзаў: крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў. Славянскі соцыум у люстры антычных гісторыкаў. Вядучая роля славянскага субстрату ў фарміраванні цэнтралізаваных структур. Сацыяльныя страты (слаі) і субкультуры. Афармленне народнай субкультуры сялян і рамеснікаў. Воінская і царкоўная субкультуры ў сілавым полі традыцый каляндарна-земляробчай шкалы народнай аксіялогіі.

Фальклtechарызацыя візантыйскай мадэлі хрысціянства. Неаязычніцкія інтэнцыі ў культуры Полацкай і Наваградскай зямель. Арыгінальныя школы ў архітэктуры і літаратуры. Скамарохі і народная смехавая культура. Духоўны гераізм інтэлігенцыі. Персаналіі: Рагвалод, Рагнеда, Усяслаў, Ефрасіння, Клімент (Смаляціч), Кірыла (Тураўскі). Атрыбуцыя персанажаў: Мікула (Селянінавіч), Вальга (князь), Усяслаў (рыцар), Баян, Аўтар («Слова»). Фарматызаваныя жанры: *храм, слова, паданне* (гераічнае), *пасланне* (публіцыстычнае). Крыж Лазара Богшы – высокі ўзор духоўнасці ў субкультуры беларускіх рамеснікаў: арганічнае адзінства культурных сэнсаў язычніцтва і хрысціянства, алегарычны вобраз духоўнай *нівы*.

Канцэпты: *райскі луг, душа адзіная, ніва, эдэм*. Ключавы напрамак сацыяльнага дзеяння – *этнічная кансалідацыя*. Аблічча духоўнай і сацыяльнай паверхні беларускай культуры ў XIV і XV стст. Храмы-крэпасці і замкі.

Візантыйскае хрысціянства ў беларускай культуры. Я. Купала, В. Ластоўскі, М. Багдановіч пра хрысціянізацыю ў Беларусі.

### *Тэма 9. Семіёзіс у беларускай культуры ў эпоху цэнтралізаванай дзяржавы*

Сацыяльныя ўтопіі ў Беларусі ў XII ст. Роля беларускага духавенства і рыцарства (баярства) у кансалідацыі этнасу і стварэнні беларускай цэнтралізаванай дзяржавы. Полацк і Нава-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

градак у гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Ашчаджальны сэнс сімволікі. Протарэнесансны рух у Беларусі ў XIII–XV стст. Вербальная сімволіка: адлюстраванне дынамікі прававой думкі і сацыяльнай практыкі: пахвала, прывілей, статут, Трыбунал, Сойм, Паны-рада, Гаспадар. Сацыяльная філасофія ў жанры казання. Інтэграваны сэнс дзяржаўнай дактрыны. Канцэпт *літвінізм*. Вехі гістарычнага часу: Прывілей Аляксандра (1492). Перамога на Сініх Водах (вызваленне Украіны). Перамогі пад Грунвальдам (1410) і пад Оршай (1508). Беларускі летапіс XV ст.: адлюстраванне культурных сэнсаў эпохі. Патрыятычная дзейнасць і трагічны лёс Мітрапаліта Герасіма. Парадыгма *гаспадар* і *гаспадарства* і яе ўвасабленне ў дзейнасці Альгерда, Вітаўта, Кейстута, Цамблака. Маральна-палітычнае адзінства беларускага этнасу ў XII–XV стст.

### *Тэма 10. Антрапацэнтрычная семантыка і нацыягенез у эпоху еўрапейскага Рэнесансу*

Беларуская шляхецкая рэспубліка Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае: дзяржаўны і грамадскі лад у кантэксце дынамікі рэнесанснага антрапацэнтрызму. Сімволіка нацыягенезу і сацыягенезу. Параўнальная характарыстыка статутаў і «Дамастрою». Гарадское саслоўе. Магдэбургскае права. Купецтва і рэнесансны рух. Філасофія чалавека – асобы і социуму. Рэфлексія біблейскай гісторыі. Эвалюцыйны рад *Прametэй-сітуацыя – Іоў-сітуацыя*. Ідэя кіраўніка-ўладара ў макіявелізме і адказ беларускай культуры на выклік. Філасофскі каментарый Ф. Скарыны да Старога Запавету. Праца Андрэя Волана «Пра ўладара і яго асабістыя дабрачыннасці» (1608). Мастацкія сімвалы эпохі: народная скульптура і графіка XVI ст. Паэма «Песня пра зубра» М.Гусоўскага. Знакавыя феномены прававой культуры (Статуты 1529 г., 1566 г., 1588 г.; Устава на валокі 1557 г.). Персаналіі – сімвалы эпохі: М. Гусоўскі, Ф. Скарына, С. Будны, В. Цяпінскі, Л. Сапега, К. Астрожскі, Ф. Кміта-Чарнабыльскі.

Ключавыя канцэпты і тэрміны: *літвінізм, русізм, апатранасць, абачлівасць, паспалітае добрае, закон прыроджаны, закон пісаны*. Сімволіка айкумены: капішча, храм, замак, селішча, царква-крэпасць. Вяночны і пагонны двор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел IV. Семіёзіс у культуры нацыянальна-дэмакратычнага тыпу (другая палова XVII–XIX ст.)

### *Тэма 11. Беларускі этнагенез і семіёзіс у эпоху Асветы*

Магнатэрыя – вышэйшая кіраўнічая каста ў палітычнай структуры Рэчы Паспалітай абодвух народаў. Антыпрыгонная вайна ў 1648–1652 гг. «Невядомая» вайна з Масковіяй (1654–1667). Грамадзянскія войны паміж магнацкімі кланамі. Магнацкія наезды. Ідэалогія *сарматызму* – спроба апраўдання магнацкай мультытыраніі. Шляхецкія канфедэрацыі. Развал парламентарызму. Рэнегацкая палітыка беларускіх дэнацыяналізаваных вярхоў. Адмена дзяржаўнага статусу беларускай мовы (1697).

Пошукі шляхоў да этнічнай кансалідацыі. Брэсцкая царкоўная унія 1596 г. Беларуская мова ва ўніяцкай царкве. Тры падзелы Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795).

Нізавое («мужыцкае») барока ў культурным працэсе. Фарміраванне новага супольнага суб'екта. Вусны фальклор. Антыжанр сеймавай прамовы. «Прамова Мелешкі». Сацыялізацыя традыцыйнай міфалагічнай сімволікі. Фальклярызацыя традыцыйных сюжэтаў у іканаграфіі. Сатырычныя вобразы «багачоў і панства». Псіхалагічны і сацыяльны тыпаж народнай скульптуры. Высокае барока ў архітэктуры. Філасофская думка. Вобраз дзяржавы-дому ў «Агульнай філасофіі» Лукі Залускага (1604–1676). «Практычнае красамоўе» Сігізмунда Лаўкеміна (1596–1670) – філасофія «праявы душы».

### *Тэма 12. Фальклярызацыя і семіёзіс у эпоху каланіяльнай залежнасці (канец XVIII–XIX ст.)*

Беларусь у складзе Расійскай імперыі. Дзяржаўная палітыка дэнацыяналізацыі. Разбурэнне нацыянальнай прававой культуры. Рэкрутчына. Адміністрацыйныя рэформы. Запрыгоньванне свабодных сялян. Удушэнне нацыянальна-вызваленчых рухаў. Закрыццё Віленскага ўніверсітэта (1832).

Асветніцкі рух. Арыентацыя на каштоўнасці «зямянскай» (народнай) культуры. Лакальны характар асветніцка-адраджэнскага руху. Арыстакратычныя культурныя кланы: Радзівілы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Храптовічы, Нарбуты, Агінскія, Манюшкі, Тышкевічы. Студэнцкі рух і пачатак антрапалагічнага даследавання беларускага этнасу. Народнае барока і рамантычна-этнаграфічная школа ў літаратуры, пластыцы, жывапісе.

Сімволіка чарадзейнай казкі. Фальклорная містэрыя ў творчасці Я.Баршчэўскага («Жыццё сіраты», «Шляхціч Завальня»), А.Міцкевіча («Дзяды»). Выкрыццё сарматызму ў народнай культуры. Рэабілітацыя літвінізму.

Гістарычныя персаналіі – як сімвалічнае ўвасабленне беларускага этнасу і яго лёсу: А. Т. Касцюшка (1746–1817), І. Насовіч (1788–1887), А. Міцкевіч (1798–1855), Я. Баршчэўскі (1794–1851), К. Каліноўскі (1838–1864), В. Дунін-Марцінкевіч (1807–1884), Ф. Багушэвіч (1840–1900). *Валенрадызм* і гераічная канцэпцыя ў рамантызме. Фальклорныя вытокі стылю *бідэрмаер*. Канцэпты *мужыцкая праўда* і *кепска будзе*. Гераічнае і ўзвышанае ў эстэтыцы фальклору.

### *Тэма 13. Беларуская народная культура і нацыянальная дактрына*

Нашаніўскі перыяд у гісторыі беларускай культуры. Неаміфалогія і парадыгмальны характар кагнітыўнага дзеяння. Вербальныя канцэпты – *знакі бяды, кепска будзе, забраны край, родны кут, новая зямля, Сам-сітуацыя, вязьмо, зверыяда, ажандараная радзіма, вялікі злодзей, жалезны звер, вымаражаныя*. Новыя сэнсы і мадыфікацыі памежнай сітуацыі *ноч перад Калядамі: Хрыстос перад Пілатам, дзеўка перад панам, гусляр перад тыранам*. Фрэйм *вялікае сэрца* – мастацка-філасофская рэпрэзентацыя *душы* беларускага этнасу. Новая эпоха ў развіцці беларускай фальклорнай семантыкі ў XIX–XXI стст.: парадыгмальныя фрэймы, атрыбутызаваныя персанажы і сітуацыі (*прамова Мелешкі, Тарас на Парнасе, Мацей (Майсей) на каранацыі (у чысцы), дзядзька ў Вільні*). Кананічныя жаночыя вобразы – сімвалы маральнай чысціні, красы і мацярынства: *разумная дачка, дзеўчына, Марыська, Бандароўна, Зоська, Ганна, Кася, Ядвіся, Паўлінка*. Гераічныя жаночыя постаці ў беларускім адраджэнскім руху: Эмілія Плятар, Палута Бадунова, Уладзіслава Станкевіч, Алаіза Пашкевіч. Вобразы-сімвалы гераізму і мацярынства ў мастацкай культуры (творы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Гараўскага, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Я. Драздовіча, М. Савіцкага, М. Танка, І. Міско).

Абагульненыя (канцэптуальныя) вобразы народных заступнікаў, філосафаў, казачнікаў: Рымшы, Парыпы, Юр'я, Несцеркі. Кагнітыўны патэнцыял тыпаў Цікаўнага і Расслабленага ў вусным фальклоры і літаратуры. Паказ дэградацыі магнацкай субкультуры і выкрыццё псеўдагераізму, каставага эгаізму, ідэалогіі сарматызму ў народных баладах і апавяданнях. Беларускі культурны працэс і этнас у люстэрку замежных і айчынных даследчыкаў.

Фальклорныя вытокі сучаснага ліра-эпасу, філасофскай лірыкі і філасофскага тэатра. Рэнесансныя інтэнцыі і сінтэз нізавога і высокага барока як антыномія сарматысцкаму дэкадансу. Фенаменалагічная эстэтыка фальклору. Творчая індывідуальнасць і беларускі культурны канон на сучасным этапе. Знакавыя фігуры беларускага этнакультурнага працэсу XIX–XX стст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*


1. *Арлоў, У.* Краіна Беларусь / У. Арлоў. – Мінск : Neografia, 2003. – 320 с.
2. *Арлоў, У.* Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны / У. Арлоў. – Мінск : Асар, 1998. – 328 с.
3. *Аўтэнтычны* фальклор: зб. навук. прац удзельнікаў VI Міжнар. навук.-практ. канф. / рэдкал. : М. А. Мажэйка [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2012. – 254 с.
4. *Бардах, Ю.* Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бардах. – Мінск : Медысонт, 2010. – 456 с.
5. *Бахтин, М.* Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса / М. Бахтин. – М. : Худож. лит., 1969. – 527 с.
6. *Башляр, Г.* Избранное: Поэтика пространства / Г. Башляр. – М. : РОССПЭН, 2004. – 376 с.
7. *Башляр, Г.* Земля и грезы воли / Г. Башляр. – М. : Изд-во гуманит. лит., 2000. – 384 с.
8. *Беларуская* думка XX стагоддзя / уклад. Ю. Гарбінскі. – Варшава : SOW, 1998. – 573 с.
9. *Бердяев, Н.* Смысл истории / Н. Бердяев. – М. : Мысль, 1990. – 175 с.
10. *Валодзіна, Т.В.* Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т. В. Валодзіна. – Мінск : Навука і тэхніка, 1999. – 168 с.
11. *Голан, А.* Миф и символ / А. Голан. – М. : РУССЛИТ, 1994. – 375 с.
12. *Грынчык, М. М.* Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі / М. М. Грынчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 294 с.
13. *Делез, Ж.* Что такое философия / Ж. Делез, Ф. Гваттари. – М. : Ин-т экспериментальной социологии ; СПб. : Алетейя, 1998. – 286 с.
14. *Домострой*. – М. : Издатель Захаров, 2001. – 140 с.
15. *Казакова, І. В.* Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І. В. Казакова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 151 с.
16. *Кацар, М. С.* Беларускі арнамент / М. С. Кацар. – Мінск : БелЭн, 1996. – 208 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. *Лангер, С.* Философия в новом ключе / С. Лангер. – М. : Республика, 2000. – 281 с.
18. *Лосев, А. Ф.* Проблема символа и реалистического искусства / А. Ф. Лосев. – М. : Искусство, 1976. – 364 с.
19. *Лявонава, А. К.* Старажытнабеларуская скульптура / А. К. Лявонава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 208 с.
20. *Малиновский, Б.* Избранное: Аргонавты западной части Тихого океана / Б. Малиновский. – М. : РОССПЭН, 2004. – 552 с.
21. *Мележ, І.* Берагчы вялікія скарбы / І. Мележ // Жыццёвыя клопаты. – Мінск : Мастац. літ., 1975. – 592 с.
22. *Памятники* философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 319 с.
23. *Пропп, В.* Морфология сказки / В. Пропп. – Ленинград : ACADEMIA, 1928. – 152 с.
24. *Семиотика:* Антология / сост. Ю. С. Степанов. – М. : Академ. проект; Екатеринбург : Деловая книга, 2001. – 702 с.
25. *Тенис, Ф.* Общность и общество / Ф. Тенис. – СПб. : Владимир Даль, 2002. – 452 с.
26. *Фром, Э.* Человеческая ситуация / Э. Фром. – М. : Смысл, 1995. – 239 с.
27. *Хрестоматия* по западной философии XVII–XVIII веков / под ред. Л. И. Яковлевой. – М. : Фаир-Пресс, 2003. – 784 с.
28. *Шпет, Г.* Искусство как вид знания / Г. Шпет. – М. : Российская политическая энциклопедия, 2007. – 712 с.

*Дадатковая*

1. *Беларускія* народныя абрады / склад. Л. П. Касцюкавец. – Мінск : Беларусь, 1994. – 128 с.
2. *Говард, М.* Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард. – Мінск : Тэхналогія, 1995. – 480 с.
3. *Лабачэўская, В.* Повязь часоў – беларускі ручнік / В. Лабачэўская. – Мінск : Беларусь, 2002. – 240 с.
4. *Мальдзіс, А.* Як жылі нашы продкі ў XVIII ст. / А. Мальдзіс. – Мінск : Мастац. літ., 2009. – 480 с.
5. *Сахута, Я. М.* Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1997. – 288 с.
6. *Фрэзер, Дж. Дж.* Золотая ветвь: Исследование магии и религии / Дж. Дж. Фрэзер. – М. : АСТ, 1998. – 784 с.
7. *Ясперс, К.* Смысл и назначение истории / К. Ясперс. – М. : Республика, 1994. – 524 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ЭТНАСЕМІЁТЫКА**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2013. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,11. Ул.-выд. арк. 0,75. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ